**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па педагагічнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра
адукацыі Рэспублікі Беларусь
________________ І.А.Старавойтава
________________
Рэгістрацыйны № ТД________/тып.

# АРХЕАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ

**Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасцей:**
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня вучэбна-метадычнага
аб’яднання па педагагічнай адукацыі

______________А.І.Жук
______________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь

_______________С.А.Каспяровіч
_______________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
агульнай сярэдняй, дашкольнай і
спецыяльнай адукацыі Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь

______________М.С. Кіндзірэнка
______________

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце Дзяржаўнай установы
адукацыі «Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»

_______________І.У.Цітовіч
_______________

Эксперт-нормакантралёр
____________ _______________
_______________

Мінск 2021

**СКЛАДАЛЬНІК**
Калечыц І.Л., дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат гістарычных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы” (пратакол № 5 ад 7 мая 2021 г.);

Калечыц А.Г., галоўны навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, доктар гістарычных навук, прафесар.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
Кафедрай усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 9 ад 30.04.2021 г.);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (пратакол № 6 ад 26.05.2021 г.);

Навукова-метадычным саветам па гуманітарнай адукацыі вучэбна-метадычнага аб’яднання па педагагічнай адукацыі (пратакол № 5 ад 27.05.2021 г.).

Адказны за рэдакцыю: І.Л. Калечыц
Адказны за выпуск: І.Л. Калечыц

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Археалогія Беларусі» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасцях 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», 1-02 01 02 «Гісторыя і сусветная мастацкая культура», 1-02 01 03 «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа».

Дапісьмовая гісторыя Беларусі складае значны прамежак часу. Менавіта археалогія даследуе перыяд, які застаўся па-за пісьмовымі помнікамі. Без вывучэння археалогіі немагчыма веданне першабытнага грамадства, гісторыі каменнага, бронзавага, жалезнага вякоў, а таксама сярэднявечча і новага часу на тэрыторыі Беларусі. Нацыянальную свядомасць немагчыма будаваць без ведання глыбокіх каранёў сваёй краіны.

Праграма распрацавана з улікам дасягненняў сучаснай гістарыяграфіі і на падставе спалучэння розных падыходаў да вывучэння гістарычнага працэсу.

**Мэтай** вывучэння дысцыпліны «Археалогія Беларусі» з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў фундаментальных ведаў у галіне археалогіі як самастойнай па метадах даследавання навукі, прызванай рабіць рэканструкцыю гістарычнага мінулага, а таксама набыцце ведаў пра археалагічную спадчыну Беларусі.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

- атрымаць тэарэтычныя веды і практычныя навыкі ў рабоце з археалагічным матэрыялам;
- умець выкарыстоўваць археалагічны матэрыял пры выкладанні курса ўсеагульнай і айчыннай гісторыі, а таксама ў краязнаўчай рабоце з вучнямі;
- стварыць неабходныя ўмовы для фарміравання ў студэнтаў пачуццяў прыналежнасці да археалагічнай спадчыны беларускага народа і адказнасці за яе захаванне;
- садзейнічаць ўсведамленню студэнтамі неабходнасці захавання дзяржаўнага суверэнітэту і выхавання ў іх патрыятызму;
- спрыяць фарміраванню ў студэнтаў навуковага светапогляду праз вывучэнне зместу вучэбнай дысцыпліны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

- помнікі археалогіі Беларусі як самастойную, спецыфічную і каштоўную гістарычную крыніцу;
- археалагічную спадчыну Беларусі: помнікі, культуры, здабыткі;
- археалагічныя перыяды і этапы засялення тэрыторыі Беларусі ад першабытных часоў;

**умець:**

- распазнаваць помнікі археалогіі па іх прыналежнасці: паселішчы (у тым ліку ўмацаваныя і неўмацаваныя), пахаванні, прамысловыя і сакральныя аб'екты;
- рэалізаваць навыкі зняцця вокамернага плана і апісанне помніка археалогіі ў выніку самастойнага выяўлення такога помніка ў краязнаўчай рабоце з вучнямі;
- чытаць стратыграфію культурных напластаванняў на помніках, дзе маюцца агаленні культурнага слою;
- даць тлумачэнне асобным катэгорыям артэфактаў, выяўленых у час палявой краязнаўчай работы;
- прымяніць па практыцы мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне помніка археалогіі, якому пагражае знішчэнне;
- выкарыстоўваць тэарэтычныя веды па археалогіі і практычныя навыкі ў рабоце з аўтэнтычным матэрыялам на уроках гісторыі;

**валодаць:**
- археалагічнай тэрміналогіяй;
- навыкамі вызначэння і датавання помікаў;
- тыпалагічным метадам вызначэння артэфактаў.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Археалогія Беларусі» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў **універсальных і базавых прафесійных кампетэнцый**:

УК-4. Працаваць у калектыве, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні.

БПК-9. Вылучаць асноўныя археалагічныя перыяды і археалагічныя культуры Беларусі, выкарыстоўваць навуковы катэгарыяльны апарат пры іх характарыстыцы і апісанні.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Археалогія Беларусі» па спецыяльнасцях 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», 1-02 01 02 «Гісторыя і сусветная мастацкая культура» і 1-02 01 03 «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа» вучэбным планам адведзена ўсяго 108 гадзін (3 зал. адз.), з іх: аўдыторных – 48 гадзін (20 гадзін – лекцый, 28 гадзін – семінарскіх заняткаў, з іх 6 гадзін кіруемая самастойная работа студэнта), на самастойную работу – 60 гадзін, экзамен у 1 семестры.

Рэкамендуемая форма бягучай атэстацыі – экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | У тым ліку | |
| | | | Лекцыі | Семінары |
| 1. | **Раздзел 1. Археалогія як навука** | **6** | **2** | **4** |
| 1.1 | Паняцце археалогіі. Прадмет, задачы, метады. | 4 | 2 | 2 |
| 1.2 | Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў кантэксце сусветных археалагічных даследаванняў. | 2 | | 2 |
| 2. | **Раздзел 2. Археалагічная перыядызацыя.** | **20** | **8** | **12** |
| 2.1 | Палеаліт и мезаліт. | 4 | 2 | 2 |
| 2.2 | Палеагеаграфічны нарыс. Першапачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі. Палеалітычныя і мезалітычныя культуры на тэрыторыі Беларусі. | 2 | | 2 |
| 2.3 | Неаліт. Неалітычныя культуры на тэрыторыі Беларусі. | 4 | 2 | 2 |
| 2.4 | Бронзавы век. Культуры бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі. | 4 | 2 | 2 |
| 2.5 | Жалезны век. | 2 | | 2 |
| 2.6 | Жалезны век на тэрыторыі Беларусі. | 4 | 2 | 2 |
| 3. | **Раздел 3. Сярэдневяковы перыяд.** | **14** | **6** | **8** |
| 3.1 | Усходнеславянскія саюзы пляменаў на тэрыторыі Беларусі па археалагічных даных. | 4 | 2 | 2 |
| 3.2 | Сярэдневяковая вёска і гарады X-XIII стст. па археалагічных даных. | 4 | 2 | 2 |
| 3.3 | Эканамічнае развіццё і культура гарадоў X-XIII стст. на тэрыторыі Беларусі | 6 | 2 | 4 |
| 4. | **Раздзел 4. Помнікі XIV-XVIII стст.** | **8** | **4** | **4** |
| 4.1 | Паселішча і могільнікі. | 4 | 2 | 2 |
| 4.2 | Рэчавы матэрыял: тэхналогія, тыпалогія, храналогія | 4 | 2 | 2 |
| | **Усяго:** | **48** | **20** | **28** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел 1. Археалогія як навука.

**Тэма 1.1. Паняцце археалогіі. Прадмет, задачы, метады**.

Паняцце археалогіі. Пісьмовыя і рэчавыя крыніцы. Мацярык, культурны слой. Пахаванне, гарадзішча, паселішча, стаянка. Археалагічныя помнікі. Археалагічныя разведкі і раскопкі. Дакументаванне. Агульная характарыстыка прынцыпаў археалагічных раскопак. Стратыграфія. Ахова помнікаў.

Археалагічная перыядызацыя і храналогія. Апрацоўка крыніц. Адкрытыя і закрытыя археалагічныя комплексы. Даціроўка археалагічнага комплекса. Археалагічная культура. Сувязь археалогіі з іншымі крыніцамі. Археалагічныя калекцыі.

**Тэма 1.2. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў кантэксце сусветных археалагічных даследаванняў.**

Славутыя археолагі сусвету.

Развіццё гістарычнага краязнаўства: першыя археалагічныя экспанаты і калекцыі. Даленга-Хадакоўскі як першы вучоны ў галіне археалогіі на тэрыторыі Беларусі. Дзейнасць Я. і К. Тышкевічаў у галіне археалогіі. І Крашэўскі. Дзейнасць археолагаў да 1917 г. Раскопкі курганаў, калекцыяніраванне знаходак і выставы, картаграфаванне знаходак. Археалагічныя з’езды. Даследаванне паселішчаў. Археалагічныя даследаванні ў 20-30-я гг. XX ст. Археалагічныя даследаванні другой паловы XX ст. Археалагічныя даследаванні ў XXI ст.

### Раздзел 2. Археалагічная перыядызацыя.

**Тэма 2.1. Палеаліт и мезаліт.**

Падставы для археалагічнай перыядызацыі.Палеаліт. Ранні палеаліт: алдувайская, ашэльская і мусцьерская эпохі. Неандэртальцы і Homosapiens. Стаянкі алдувайскай эпохі. Каменныя вырабы алдувайскага часу. Стаянкі ашэльскай эпохі. Каменныя вырабы ашэльскага часу. Мусцье: стаянкі і прылады.Чопер, сфероід, клівер, рубіла, скрэбла, востраканечнік, нуклеус. Рэтуш. Паляванне і збіральніцтва. Позні палеаліт. Прылады, матэрыялы, жытлы, заняткі. Паляўнічая магія, культ звяроў. Першабытны жывапіс.

Мезаліт. Мезалітычныя прылады. Мікраліты і макраліты. Асноўныя заняткі чалавека. Стаянкі. Мастацтва мезаліта.

**Тэма 2.2. Палеагеаграфічны нарыс. Першапачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі. Палеалітычныя і мезалітычныя культуры на тэрыторыі Беларусі.**

Муравінское міжледавікоўе. Паазерскае злядзененне.

Мусцьерская эпоха на тэрыторыі Беларусі. Юравіцкая познепалеалітычная стаянка. Бердыжская стаянка.

Фінальны палеаліт. Гамбургская культура. Культура бромэ-лінгбі. Свідэрская культура. Грэнская культура. Валкушанская культура.

Мезаліт. Пясочнароўская культура. Кундская культура. Бутаўская культура. Кудлаеўская культура. Каморніцкая культура. Яніславіцкая культура. Помнікі нарачанскага тыпу.

**Тэма 2.3. Неаліт. Неалітычныя культуры на тэрыторыі Беларусі.**

Неалітычныя паселішчы. Прылады працы. Асноўныя заняткі. Стаянкі і жытлы. Кераміка.

Днепра-данецкая культура. Нёманская культура. Прыпяцка-нёманская культура. Верхнедняпроўская культура. Нарвенская культура. Культура грабенчата-ямкавай керамікі. Культура шарападобных амфар. Помнікі тыпу Бабінавічаў. Усвяцкая культура.

**Тэма 2.4. Бронзавы век. Культуры бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі.**

Энеаліт. Прылады працы. Заняткі. Жытлы. Кераміка. Трыпольская культура.

Сярэднедняпроўская культура. Культура палескай шнуравой керамікі. Паўночнабеларуская культура. Тшцінецкая культура. Помнікі сосніцкага тыпу. Культура сярэдняй і позняй бронзы Паазер'я.

**Тэма 2.5. Жалезны век.**

Прынцыпы прыгатавання жалезнай руды. Крыца. Домніца.

Культура Урарту. Скіфы и сарматы. Антычныя дзяржавы Паўночнага Прычарнамор'я.

**Тэма 2.6. Жалезны век на тэрыторыі Беларусі.**

Мілаградская і паморская культуры. Культура штрыхаванай керамікі. Днепро-двінская культура. Зарубінецкая культура. Кіеўская і вельбарская культуры.

Культуры ранняга сярэдневякоўя: помнікі тыпу Прагі-Корчак і Лукі-Райкавецкай, калочынская, банцараўская, культуры ранніх доўгіх курганаў і ўсходнелітоўскіх курганаў.

**Раздел 3. Сярэдневяковы перыяд.**

**Тэма 3.1. Усходнеславянскія саюзы пляменаў на тэрыторыі Беларусі па археалагічных даных.**

Полацкія крывічы. Дрыгавічы. Радзімічы. Насельніцтва Панямоння.

**Тэма 3.2. Сярэдневяковая вёска і гарады X-XIII стст. па археалагічных даных.**

Сельскія паселішчы. Земляробства. Жывёлагадоўля, промыслы і рамёства.

Гарады Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі. Гарады Паўднёвай Беларусі. Гарады беларускага Панямоння. Гарады Усходняй Беларусі.

**Тэма 3.3. Эканамічнае развіццё і культура гарадоў X-XIII стст. на тэрыторыі Беларусі**

Масавыя жытлы і гаспадарчыя пабудовы. Рэчавы інвентар. Тэхналогія рамёстваў. Гандаль і прыазныя вырабы. Манетныя і манетна-рэчавыя скарбы. Пісьменства. Мураванае дойлідства. Помнікі выяўленчага мастацтва.

## Раздзел 4. Помнікі XIV-XVIII стст.

**Тэма 4.1. Паселішча і могільнікі.**

Гарады, іх функцыянальннае прызначэнне, тыпы гарадоў. Археалагічнае вывучэнне гарадоў. Тэрытарыяльна-планіровачнае развіццё гарадоў. Масавае жыллё і гаспадарчыя пабудовы. Камунальныя пабудовы.

Мястэчкі: агульная характарыстыка і тыпы планіроўкі. Асаблівасці матэрыяльнай культуры мястэчак.

Замкі. Паняцце “замак”, тыпы замкаў. Археалагічнае вывучэнне замкаў.

Сельскія паселішчы. Матэрыяльная культура, сістэмы рассялення. Неўмацаваныя феадальныя сядзібы.

Манументальнае дойлідства. Абаронныя аб’екты. Культавыя пабудовы. Манастырскія комплексы. Помнікі грамадзянскага дойлідства.

Могільнікі. Вясковыя могільнікі. Агульная характарыстыка і тыпалогія пахаванняў. Пахаванні ў гарадах і мястэчках, іх археалагічнае вывучэнне. Познесярэдневяковыя паганскія свяцілішчы і культавыя аб’екты.

**Тэма 4.2. Рэчавы матэрыял: тэхналогія, тыпалогія, храналогія**

Вытворчасць жалеза, металічныя вырабы. Прылады працы і побытавыя рэчы: асартымент, тыпалогія, храналогія. Зброя, рыштунак вершніка. Ліцейная справа. Вырабы з каляровага металу.

Вырабы з гліны. Керамічны посуд: асартымент, тыпалогія, храналогія, тэхналогія апрацоўкі. Імпартныя рэчы. Будаўнічыя матэрыялы. Кафля і кафляныя печы.

Вырабы са шкла: асартымент, тыпалогія, храналогія, тэхналогія апрацоўкі.

Вырабы са скуры, іх апрацоўка, інструмент, тэхналогія пашыву.

Дрэва, костка, камень: апрацоўка і вырабы.

Матэрыялы нумізматыкі, сфрагістыкі, метралогіі, знойдзеныя пры раскопках.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

#### Асноўная


1. Загорульский, Э. М. Археология : пособие / Э. М. Загорульский. – Минск : БГУ, 2020. – 343 с.
2. Калечыц, А. Г. Мезалітычныя помнікі Беларусі / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў. – Мінск : Беларуская навука, 2021. – 369 с.
3. Археалогія Беларусі : у 4 т. / Нац. Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 1997-2001.
4. Калядзінскі, Л. У. Асновы археалогіі: уводзіны ў прадмет : дапаможнік / Л. У. Калядзінскі. – Гродна, 2013. – 197 с.


#### Дадатковая


1. Богомольников, В. В. Радимичи (по материалам курганов X-XII вв.) / В. В. Богомольников. – Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины, 2004. – 226 с.
2. Дук, Д. У. Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX–XVIII стст. (па выніках раскопак 2004-2-12 гг.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – 252 с.
3. Егорейченко, А. А. Культуры штрихованной керамики / А. А. Егорейченко. – Минск : БГУ, 2006. – 207 с.
4. Загорульский, Э. М. Вищинский замок / Э. М. Загорульский. – Минск : БГУ, 2004. – 159 с.
5. Загорульский, Э. М. Славяне: происхождение и расселение на территории Беларуси / Э. М. Загорульский. – Минск : БГУ, 2012. – 315 с.
6. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Минск : Наука и техника, 1995. – 207 с.
7. Калечиц, Е. Г. Первоначальное заселение территории Беларуси / Е. Г. Калечиц. – Минск : Наука и техника, 1984. – 159 с.
8. Колосов, А. В. Каменный век Беларуси : пособие / А.В. Колосов. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – 112 с.
9. Левко, О. Н. Практическая археология : учеб. пособие / О. Н. Левко. – Могилев : Изд-во Могилевского ун-та им. А. А. Кулешова, 2006. – 256 с.

## РЭКАМЕНДУЕМЫЯ ФОРМЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

Асноўнымі метадамі (формамі) навучання, якія адказваюць мэтам вучэбнай дысцыпліны, з'яўляюцца: метады праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, часткова-пошукавы і даследчы метады), інтэрактыўныя метады і метад праектаў, якія спрыяюць падтрыманню аптымальнага ўзроўню актыўнасці.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці засваення ведаў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендуецца выкарыстоўваць наступны дыягнастычны інструментарый:

1. Вусная форма:
– сумоўе;
– даклады на семінарах;

2. Пісьмовая форма:
– тэсты;
– кантрольная работа;
– пісьмовы экзамен;
– ацэньванне на аснове рэйтынгавай сістэмы.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш ўтрымліваюць ўстаноўку на набыццё і замацаванне вызначанага Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі аб'ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў шэрагу навыкаў разумовых аперацый – уменне ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г.д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1) пракаментаваць выказванне – растлумачыць, якая ідэя заключана ў урыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сьведчыць;
2) параўнаць – выявіць падабенства і адрозненне пазіцый па пэўных прыкметах;
3) абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу – прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў;
4) аргументаваць (абгрунтаваць, даказаць, растлумачыць) адказ;
5) правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з'явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага, неабходнага і вызначае;
6) тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – выкарыстоўваючы

матэрыял навучальных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не на шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні вучэння;
7) адлюстраваць схематычна – значыць раскрыць змест адказу ў выглядзе табліцы, малюнка, дыяграмы і іншых графічных формаў.

Важнай складнікам самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі з'яўляецца праца з літаратурай да ўсіх відах заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да залікаў, экзаменаў, тэсціравання, удзелу ў навуковых канферэнцыях.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Форма запісаў можа быць вельмі разнастайнай: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект.

Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой від інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўменне і звычкі рабіць што-небудзь правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

*Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў.*

Напісанне пісьмовых навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

- навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;
- прышчапленню навыкаў рэферыравання навуковых артыкулаў па праблематыцы вывучаемых дысцыплін;
- выпрацоўцы ўмення падрыхтоўкі дакладаў, выступаў і паведамленняў;
- набыццё досведу выступу з дакладамі на семінарскіх занятках;
- сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;
- далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы;
- навучанне студэнтаў выкладаць матэрыял у выглядзе стройнай сістэмы тэарэтычных палажэнняў, звязаных лагічнай паслядоўнасцю і падмацаваных прыкладамі з практыкі.